Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЛЮТАГА 2014 г. СУБОТА № 34 (27644) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

На варце міру і бяспекі роднай краіны

ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!
Паважаныя воіны і ветэраны Узброеных Сіл!

Сардэчна віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Гэта свята стала сапраўды народным. Яно сімвалізуе пераемнасць патрыятычных традыцый, мужнасць і сілу духу людзей у пагонах, якія стаяць на варце міру і бяспекі роднай краіны.

У гэтым годзе, калі адзначаецца 70-годдзе вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, мы адчуваем асаблівую ўдзячнасць ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія адстаялі нашу незалежнасць. Іх подзвіг — прыклад для новых пакаленняў абаронцаў Радзімы.

Салдаты і афіцэры Узброеных Сіл з гонарам прадаўжаюць слаўныя традыцыі герояў-вызваліцеляў, забяспечваючы суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы.

Выказваю шчырую ўдзячнасць усім, хто ўносіць дастойны ўклад ва ўмацаванне абараназдольнасці Беларусі.

Жадаю вам здароўя, міру, шчасця і поспехаў на службе і ў працы на карысць Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ МЗС — ПАДТРЫМАННЕ НАШЫХ ЭКАНАМІЧНЫХ ІНТАРЭСАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 лютага прыняў з дакладам міністра замежных спраў Уладзіміра Макея. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што крытэрыі работы на знешнепалітычным вектары застаюцца нязменныя. «Галоўнае — гэта падтрыманне нашых эканамічных інтарэсаў. Апошнім часам прапануецца адкрыццё шэрагу пасольстваў за мяжой. Я абсалютна не супраць гэтага, але пасольствы павінны адкрывацца выключна з гэтай мэтай, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нам ніякай глабальнай палітыкай у свеце займацца няма чаго. Калі ў нас ёсць эканамічны інтарэс у нейкай краіне ў плане дыверсіфікацыі, перш за ўсё экспарту, знешняга гандлю, тады там і наша палітыка».

Прэзідэнт запатрабаваў далажыць аб рабоце па выкананні раней дадзеных даручэнняў, у тым ліку ў сферы еўразійскай інтэграцыі, падрыхтоўкі дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка папрасіў зрабіць акцэнт менавіта на праблемных момантах. «Гэта працэс новы, ён не можа ісці без якіх-небудзь ускладненняў, праблем. Гэтага проста не бывае», — заўважыў беларускі лідар.

Уладзімір Макей праінфармаваў Прэзідэнта аб пазіцыях бакоў пры падрыхтоўцы дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза. Асобна кіраўніку дзяржавы было даложана аб перагаворах, якія вядуцца Расіяй і Казахстанам у кантэксце ўступлення Казахстана ў СГА. Прэзідэнт даў канкрэтныя даручэнні па падрыхтоўцы адпаведных пазіцыйных матэрыялаў для абмеркавання ў ходзе маючага адбыцца пасяджэння «тройкі», якое намечана на сярэдзіну сакавіка.

«Я хацеў бы пачуць інфармацыю аб нашай рабоце на заходнім напрамку. Думаю, ва ўсходнім напрамку ў нас праблем у прынцыпе няма, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўчора тройчы размаўляў з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі. У бліжэйшы час, я думаю, мы з Уладзімірам Уладзіміравічам знойдзем у сваім графіку магчымасць сустрэцца і абмеркаваць яшчэ раз сумесныя дзеянні ў сучасных умовах».

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь імкнецца праводзіць шматвектарную палітыку. «Мы яе будзем ажыццяўляць. Нам не патрэбны ніякія праблемы на Захадзе і тым больш на Усходзе. Але гэта не значыць, што мы пачынаем шарахацца, штосьці выгадваць, змяняць нашы крытэрыі, палітыку. Наша палітыка застаецца нязменнай. Яна вызначана маім Пасланнем да беларускага народа і парламента», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Макей далажыў, што на праведзенай некалькі дзён таму калегіі МЗС былі падведзены вынікі работы і пастаўлены задачы на бягучы год. Паводле слоў міністра, палавіна з пяці дзясяткаў беларускіх пасольстваў па выніках года не выканалі ўстаноўленых паказчыкаў у частцы развіцця экспарту і прыцягнення інвестыцый. «Дадзены абсалютна крытычныя ацэнкі рабоце і цэнтральнага апарату МЗС, і загранустаноў, — сказаў міністр. — У бліжэйшы час будзе падрыхтаваны адпаведны загад МЗС, у якім будуць адлюстраваны ўсе гэтыя моманты і зроблены высновы».

Што датычыцца адносін Беларусі з Еўрасаюзам і ЗША, Уладзімір Макей адзначыў, што ў гэтай сферы намеціліся пэўныя зрухі. «Мы лічым, што сур'ёзнага прарыву не дасягнута з улікам таго, што ў нашых адносінах існуюць рэальныя перашкоды, якія, на жаль, не могуць быць пераадолены на працягу аднаго дня або месяца, але намеціліся зрухі, якія даюць магчымасць гаварыць аб тым, што з'явілася надзея на нармалізацыю нашых адносін з ЕС і ЗША», — сказаў міністр.

Уладзімір Макей таксама далажыў, як вядзецца работа над пагадненнямі з ЕС аб аблягчэнні візавага рэжыму і аб рэадмісіі.

Прэзідэнт заявіў, што беларускі бок гатовы да адкрытага і шчырага дыялогу з еўрапейскімі партнёрамі, ЗША, але не за кошт ушчамлення сваіх нацыянальных інтарэсаў.

«МЗС будзе кіравацца гэтымі ўстаноўкамі кіраўніка дзяржавы ў ажыццяўленні сваёй дзейнасці. Мы бачым, да чаго прыводзіць у тым ліку і патуранне радыкалізму і экстрэмізму з боку некаторых нашых еўрапейскіх партнёраў на прыкладзе некаторых суседніх краін», — сказаў Уладзімір Макей па выніках сустрэчы.

Уладзімір Арчакоў назначаны намеснікам дзяржсакратара Савета Бяспекі Беларусі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў палкоўніка Уладзіміра Арчакова намеснікам дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, вызваліўшы яго ад пасады начальніка ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Генерал-маёр Аляксей Ялфімаў вызвалены ад пасады намесніка дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь і звольнены з ваеннай службы ў запас па ўзросце.

Палкоўнік Сяргей Феакцістаў назначаны начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці. Адпаведныя ўказы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 21 лютага.

■ 23 лютага — Дзень абаронцаў Айчыны

АДЗІН ЛЁС НА ДВАІХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзень абаронцаў Айчыны для курсантаў агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Артура і Аляксея ЦІШКО праходзіць па-сямейнаму. І не таму, што свята юнакі адзначаюць на малой Радзіме. Адчуць роднае плячо могуць яны і ў сценах навучальнай установы. Толькі зазірні ў суседнюю казарму — і насустрач выйдзе твой сямейнік, табе ўсміхнецца брат.

СТАР. 6

ЛІЧБА ДНЯ

22 тыс. 338 чалавек

зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў Беларусі. Сярэдняя колькасць кандыдатаў на 18 тысяч 816 выбарчых округ — 1,2. Зарэгістраваныя кандыдаты ў дэпутаты вылучаліся шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў — 66,8%, ад працоўных калектываў — 34,6%, ад палітычных партый — 3%. Перадвыбарная агітацыя кандыдатаў пройдзе па 22 сакавіка ўключна, паведаміў сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік. Па словах сакратара ЦВК, прэтэндэнты на дэпутацкі мандат пасля рэгістрацыі, якая праходзіла 11-20 лютага, і атрымання пасведчання маглі прыступаць да перадвыбарнай агітацыі. Мікалай Лазавік распавёў аб асноўных навацыях у правядзенні агітацыі ў сувязі з прынятымі папраўкамі ў выбарчае заканадаўства. «Самае асноўнае — забаронена агітацыя за байкот выбараў, прычым не толькі кандыдатам у дэпутаты, але і любому іншаму грамадзяніну», — адзначыў сакратар ЦВК.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.02.2014 г.

Долар ЗША	9730,00	▲
Еўра	13340,00	▼
Рас. руб.	273,00	▲
Укр. грыўня	1051,89	▼

■ Прамая лінія

ПАДТРЫМКА ПА АДРАСЕ

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны адказаў на пытанні нашых чытачоў наконт дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі

(Працяг «прамой лініі». Пачатак у «Звяздзе ад 21 лютага 2014 года.)

Не паспеў Аляксандр Румак пакласці трубку, як тут жа раздаецца наступны тэлефонны званок.

— Добры дзень! Гэта вам тэлефануюць з Халопенічаў Крупскага раёна. Мяне завуць Скулубовіч Уладзімір Яфрэмавіч. Я інвалід 2 групы, жыву адзін: ні сям'і, ні дзяцей. Якую я магу атрымаць сацыяльную дапамогу?

— А скажыце, калі ласка, колькі складае ваша пенсія?

— Цяпер трохі дабавілі, стала 2,3 млн рублёў. Усюды гавораць, як добра дапамагаюць у нас пенсіянерам, а вось я ніякай дапамогі не атрымліваю.

— Уладзімір Яфрэмавіч, а сацыяльны работнік да вас прыходзіць?

— Прыходзіць, дапамагае.

— Ну вось, значыць, пра вас таксама не забылі. Што ж тычыцца адраснай сацыяльнай дапамогі, то ў вас такая пенсія, што вы пад яе не падпадаеце. Але вы можаце звярнуцца па матэрыяльную дапамогу з Фонду сацабароны насельніцтва.

— Я звяртаўся. Мне сказалі, што не паложана.

— Уладзімір Яфрэмавіч, вы напішыце заяву і аддайце свайму сацработніку. Яе павінны разгледзець і даць вам адказ.

— Вас турбуе Васілеўскі Аляксандр Кузьміч са Шклова.

— Слухаю, Аляксандр Кузьміч. Што за пытанне ў вас?

— Я інвалід 2 групы з дзяцінства. У мяне ёсць аўтамабіль «Ака» 1999 года выпуску. Я набыў яго па лініі «сабеса». І без гэтай машыны я нікуды. Але справа ў тым, што згодна з транспартным падаткам, што быў уведзены, я павінен заплаціць тры базавыя велічыні. А яшчэ за тэхагляд... І ўсё гэта са сваёй пенсіі. Крыўдна, што мне, інваліду, трэба плаціць, як і ўсім. У мяне ж нават не малалітражка, а мікрааўтамабіль.

— Я падзяляю вашу трывогу, Аляксандр Кузьміч. Але сёння льготы па дзяржаўнай пошліне прадугледжаны толькі для механічных транспартных сродкаў з ручным кіраваннем. Каб вырашыць пытанне па іншых транспартных сродках, можна звярнуцца ў тэрытарыяльны орган Міністэрства транспарту і камунікацый і падатковую інспекцыю.

— Гэта тэлефануе жыхар вёскі Глушкавічы Лельчыцкага раёна Грамыка Ігар Мікалаевіч.

У нашай сям'і 6 чалавек, з іх чацвёра — дзеці. Якая сума павінна выходзіць на аднаго чалавека, каб мець права на адрасную сацыяльную дапамогу? Нашым дзецям 6 месяцаў, 5,9 і 12 гадоў. На кожнага чалавека ў месяц у прошлым годзе атрымалі 980 тысяч рублёў.

— Вы, як я разумею, ужо звярталіся ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне...

— Так.

— Вам, пэўна, тлумачылі... Сёння ўстаноўлены бюджэт пражытачнага мінімуму ў памеры 1 млн 128 тыс. рублёў. Але, калі мы бяром сям'ю, то да гэтай сумы прымяняецца каэфіцыент — тут улічваецца эфект сумеснага пражывання, бо яно абыходзіцца танней і ідзе эканомія сродкаў. Гэта зацверджана пастановай Савета Міністраў №274. Дык вось, калі мы прыменім гэты каэфіцыент да вас, то аказваецца, што ваш даход усяго на 3 тысячы, але перавышае той, пры якім вы можаце разлічваць на дапамогу.

СТАР. 2

■ Курсавая розніца

ПАЛІТЫКА ЭКАНОМІЦЫ НЕ ТАВАРЫШ?

Палітычны крызіс ва Украіне прывёў да падзення курсаў нацыянальных валют у краінах Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

Сярод гэтых дзяржаў — Венгрыя, Польшча, Румынія, Сербія, Харватыя і Чэхія. Зніжаецца, зразумела, і курс грыўні. А міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Standard & Poor's панізіла сёння доўгатэрміновы крэдытны рэйтынг Украіны ў замежнай валюце на адну прыступку да пераддэфолтнага ўзроўню ССС. «Агенцтва лічыць, што ў цяперашняй сітуацыі зніжаецца магчымасць украінскага ўрада абслугоўваць даўгі і павышаецца няпэўнасць адносна далейшага прадастаўлення Расіяй фінансавай дапамогі краіне на працягу 2014 года», — паведамляюць інфармагенцтвы.

На «строгай дыеце» сядзіць і расійскі рубель: ён стабільна худзее. Ніякія захады не дапамагаюць у змяненні сітуацыі. Праўда, у хуткім часе «драўляны» можа атрымаць невялікі штуршок для пад'ёму. Справа ў тым, што яшчэ адзін палітычны крызіс — у Алжыры — можа неўзабаве справакаваць рост цэн на нафту, ад якіх рубель даволі моцна залежыць. Карацей, у гэтай афрыканскай краіне прагназуюць паўторныя атакі тэрарыстаў на інфраструктурныя аб'екты ў месцах здабычы нафты. Калі прагноз спраўдзіцца, то кошт нафты рэзка павысіцца. Вось толькі эксперты кажуць, быццам такі пад'ём будзе нядоўгім.

Еўра і долар на гэтым тыдні не паказалі нейкіх адметных вынікаў. На айчынным жа валютным рынку навіны наступныя. Долар падаражэў яшчэ на 20 рублёў (плюс 0,2%) да 9730, а еўра — на 30 рублёў (плюс 0,2%) да 13340. Расійскі рубель у чарговы раз знізіўся: на 2,5 грашовай адзінкі (мінус 0,9%) да 273.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯНУКОВІЧ ПАГАДЗІЎСЯ НА ДАТЭРМІНОВЫЯ ВЫБАРЫ

Ці спыніць хвалю насілля дагавор з лідарамі апазіцыі?

Нягледзячы на абвешчанае ў ноч на пятніцу рашэнне Вярхоўнай Рады аб адмене антытэрарыстычнай аперацыі, зацішша аказалася нядоўгім. Апоўдні ў пятніцу радыкалы са зброяй пачалі прарывацца да будынка Рады ў Кіеве, ведучы пры гэтым агонь па супрацоўніках унутраных войскаў, перадае NEWSru.ua. Магчыма, пакласці канец гвалту змогуць датэрміновыя выбары прэзідэнта, на якія згадзіўся Віктар Януковіч.

Прэзідэнт Украіны пасля перамоў з лідарамі апазіцыі і прадстаўнікамі краін Еўрасаюза заявіў, што ініцыюе вяртанне да Канстытуцыі 2004 года з пераразмеркаваннем паўнамоцтваў у бок парламенцкай рэспублікі і падрыхтоўку да выбараў.

«Заяўляю пра тое, што я ініцыюю датэрміновыя прэзідэнцкія выбары. Я ініцыюю таксама вяртанне да Канстытуцыі 2004 года з пераразмеркаваннем паўнамоцтваў у бок парламенцкай рэспублікі». Януковіч таксама заклікаў да «пачатку працэдуры фарміравання ўрада нацыянальнага даверу».

«У гэтыя трагічныя дні, калі Украіна панесла такія цяжкія страты, калі загінулі людзі па абодва бакі барыкад, лічу сваім абавязкам перад светлай памяццю загінулых заявіць: нічога няма больш важнага за жыццё чалавека, — сказана ў дакуменце. — І няма такіх крокаў, якія б мы ўсе разам не павінны былі зрабіць, каб аднавіць мір ва Украіне».

Між тым даныя сацыялагічнага апытання кампаніі «Соцыс», апублікаваныя 31 студзеня, паказваюць, што, калі б выбары адбыліся 2 лютага, у тройцы лідараў мог бы аказацца дзеючы кіраўнік дзяржавы Віктар Януковіч.

Тым часам Міністэрства аховы здароўя Украіны прывяло трагічную статыстыку. З 18 па 21 лютага з месца абвастрэння сутыкненняў у цэнтры Кіева да брыгад экстраннай медыцынскай дапамогі і ва ўстановы аховы здароўя горада Кіева па медыцынскую дапамогу звярнуліся 577 пацярпелых, 369 з іх шпіталізаваны. З пачатку сутыкненняў загінулі 77 чалавек...

З гэтай нагоды паказальны зварот да народа в.а. міністра ўнутраных спраў Украіны Віталя Захарчанкі. Тэкст размешчаны на афіцыйным сайце ведамства.

«Абараняючы экстрэмістаў, вы змагаецеся не супраць улады або міліцыі — вы ваюеце супраць сябе і сваёй Радзімы», — заявіў ён. «Калі я бачу сёння людзей, якія стаяць у чэргах па хлеб, у чэргах да банкаматаў і аўтазаправак, бачу вочы жанчын, якія вывозяць з Кіева сваіх дзяцей, а таксама скрываўленых людзей, пацярпелых у выніку супрацьстаяння, у мяне цяжка на душы. Цяжка ад таго, што хтосьці імкнецца падзяліць народ, — гаворыцца ў звароце . — І калі СМІ кажуць, што з аднаго боку загінулі 13 чалавек, а з другога — 67, для мяне гэта гучыць дзіка, бо гэта загінулі 80 нашых грамадзян, украінцаў, якіх уводзяць у зман умелай прапагандай». На думку кіраўніка МУС, людзі ў рэгіёнах блакіруюць дзяржаўныя ўстановы і аддзяленні міліцыі, але пры гэтым не разумеюць да канца сутнасці тых працэсаў, якія сёння адбываюцца ў дзяржаве. «Каго яны абараняюць? Кучку экстрэмістаў, якім не патрэбны спакой у дзяржаве? Або іх лялькаводаў, якія дзейнічаюць па сцэнарыях Сірыі, Егіпта і іншых краін, што фактычна сёння ўцягнуты ў хаос. Няўжо мы хочам, каб працягваліся марадзёрства і пагромы? Няўжо нас нічому не навучыла гісторыя? Бо заўтра гэтыя баевікі са зброяй прыйдуць дадому да людзей: камусьці спадабаецца чыясьці машына, і ён яе забярэ, а камусьці не спадабаецца хтосьці — і ён яго заб'е», — адзначае Віталь Захарчанка.

У якасці прыкладу ён прыводзіць сітуацыю ў Львове, дзе хоць і абвешчана ўлада народнай рады, але райаддзелы ўзяты ў аблогу, перастала працаваць лінія 102. Людзі ў паніцы і не могуць выклікаць міліцыю, працягваюцца пагромы і марадзёрства, але звярнуцца па дапамогу і абарону ад баевікоў няма да каго.

ISSN 1990 - 763X

■ Дзяржаўны клопат

«ДАЖЫНКІ»: РАЗУМНА, ТАЛКОВА, ЭФЕКТЫЎНА І ТАННА

У Віцебскім аблвыканкаме адбылося выязное пасяджэнне рэспубліканскага штаба па падрыхтоўцы і правядзенні фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2014». У пасяджэнні прыняў удзел намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл Русы.

Фота БЕЛТА.

Пры падрыхтоўцы Гарадка да правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі» ўсё павінна быць зроблена добра са сціплым бюджэтам, заявіў Міхаіл Русы. Паводле яго слоў, ужо складзена базавая праграма па аб'ектах, якія неабходна падрыхтаваць да правядзення рэспубліканскага свята працаўнікоў вёскі. Між тым, кожны з іх варта яшчэ раз уважліва ацаніць на месцы, прадумаць мэтазгоднасць запланаваных мерапрыемстваў. Ва ўсім павінен прысутнічаць разумны падыход. Пры гэтым вырашыць пытанні з аб'ёмам неабходных на падрыхтоўку аб'ектаў сродкаў варта ў самыя сціслыя тэрміны, бо ўжо на наступным тыдні плануецца падрыхтаваць фінансавае абгрунтаванне.

«Гарадок — невялікі населены пункт, таму на ўсёй яго тэрыторыі да свята павінен быць наведзены ідэальны парадак. Усё павінна быць зроблена разумна, талкова, эфектыўна і танна. Мера адказнасці кожнага — самая высокая», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер. Ён адзначыў, што асаблівую ўвагу трэба надаць аб'ектам, якія закранаюць інтарэсы насельніцтва, каб потым не было скаргаў.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец паведаміў, што завяршыць падрыхтоўку аб'ектаў Гарадка да «Дажынак» плануецца да 1 верасня.

Як праінфармаваў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў, работа па падрыхтоўцы Гарадка да свята працаўнікоў вёскі пачалася яшчэ ў 2013 годзе. Абласнымі службамі быў вызначаны пералік аб'ектаў, якія неабходна прывесці ў належны выгляд, замоўлена праектна-каштарысная дакументацыя. «На сёння на 90% яна гатова. Пытанні ёсць толькі па асобных аб'ектах, але яны вырашаюцца. Такім чынам, дакументацыя нас не стрымлівае, можам пачынаць актыўна працаваць», — сказаў Аляксандр Ацясаў.

З абласнога бюджэту на падрыхтоўчыя работы летась было выдзелена Br50 млрд. На 2014-ы на ўсе аб'екты будаўніцтва і рэканструкцыі, работы на якіх могуць фінансавацца за кошт бюджэтных сродкаў, плануецца накіраваць Br435 млрд. Акрамя таго, фінансаванне будзе ажыццяўляцца па лініі прадпрыемстваў і арганізацый, уласнікаў аб'ектаў, спонсарскай дапамогі.

Міхаіл Русы даручыў Мінбудархітэктуры ўзяць на кантроль кожны аб'ект, які рыхтуецца да рэспубліканскіх «Дажынак», тэрміны выканання праектна-каштарыснай дакументацыі, будаўніцтва і рэканструкцыі. «Будзьце ашчадныя, але прывядзіце ў парадак горад», — сказаў ён на заканчэнне.

Пасля ўдзельнікі штаба наведалі аб'екты ў Гарадку і Гарадоцкім раёне.

Паводле паведамленняў БЕЛТА.